Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

31 студзеня 2018 года, № 2 (2190)

## У нумары:

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ АПЛАТА ПРАЦЫ І ЎДАСКАНАЛЕННЕ ЗМЕСТУ АДУКАЦЫІ
На пашыраным пасяджэнні рэктарата былі абмеркаваны асноўныя напрамкі дзейнасці ўніверсітэта
Стар. 2

ФУНДАМЕНТАЛЬНАЯ НАВУКА ТАКСАМА ПРЫНОСІЦЬ ПРЫБЫТАК
Гутарка з дырэктарам НДІ ядзерных праблем Сяргеем МАКСІМЕНКАМ пра вынікі працы інстытута за мінулы год
Стар. 4

ЮРФАК – ТЫТАН СТУДЭНЦКАГА СПОРТУ
Юрыдычны факультэт стаў пераможцам круглагадовай студэнцкай спартакіяды ў 14 раз
Стар. 6

РЭЙТЫНГІ

# БДУ сярод 500 найлепшых універсітэтаў свету!

**БДУ ўпершыню ўвайшоў у 500 найлепшых універсітэтаў у Сусветным вэбаметрычным рэйтынгу ўніверсітэтаў Webometrics Ranking of World Universities (WRWU).**



RANKING WEB OF UNIVERSITIES

Belarus

| ranking | World Rank | University | Det. | Presence Rank* | Impact Rank* | Openness Rank* | Excellence Rank* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 487 | Belarusian State University / Белорусский государственный университет | | 282 | 342 | 238 | 840 |
| 2 | 2955 | Belarusian National Technical University / Белорусский национальный технический университет | | 753 | 5242 | 3018 | 3300 |
| 3 | 2972 | Academy of Public Administration of the President of the Republic of Belarus / Академия управления при Президенте Республики Беларусь | | 4362 | 11073 | 8932 | 969 |
| 4 | 3359 | Yanka Kupala State University of Grodno / Гродненский государственный университет Янки Купалы | | 907 | 4384 | 2875 | 4162 |
| 5 | 3544 | Belarusian State University of Informatics and Radioelectronics / Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники | | 1663 | 6491 | 3967 | 3780 |
| 6 | 4227 | Belarusian State Technological University / Белорусский государственный технологический университет | | 1375 | 8753 | 4055 | 4279 |

У рэдакцыі рэйтынгу за студзень 2018 года БДУ заняў 487 месца, падняўшыся на 19 пазіцый у параўнанні з паказчыкамі мінулага года (у ліпені 2017 – 506 месца). Усяго ў рэйтынгу Webometrics улічваюцца дадзеныя 27 000 вышэйшых навучальных устаноў (усяго ў свеце налічваецца больш за 30 000 ВНУ). Лідарамі рэйтынгу па традыцыі з'яўляюцца Гарвардскі ўніверсітэт, Стэнфардскі ўніверсітэт і Масачусецкі тэхналагічны інстытут.

Сёлета сярод універсітэтаў СНД БДУ заняў другую пазіцыю, саступіўшы толькі Маскоўскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту імя М. В. Ламаносава (235 месца), і ўпершыню абышоў у рэйтынгу Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт (491 месца).

Сярод найлепшых універсітэтаў краін-суседзяў у рэйтынгу прадстаўлены: Варшаўскі ўніверсітэт (401 месца), Тартускі ўніверсітэт (441), Вільнюскі ўніверсітэт (744), Латвійскі ўніверсітэт (1128), Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт імя Тараса Шаўчэнкі (1273).

Сярод беларускіх ВНУ БДУ нязменна захоўвае першынство. Другое месца займае Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт – 2955 пазіцыя. На трэцім месцы – Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (2972), на чацвёртым – Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы (3359 пазіцыя), а замыкае пяцёрку Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі (3544 месца).

На працягу апошніх гадоў БДУ дэманструе ўстойлівасць сваіх пазіцый у рэйтынгу WRWU, уваходзячы ў 2 % найлепшых сусветных універсітэтаў. У рэйтынгу найлепшых універсітэтаў свету QS World University Rankings 2017/18 БДУ займае высокае 334 месца.

У 2017 годзе БДУ ўпершыню ўвайшоў у найстарэйшы і адзін з самых прэстыжных сусветных рэйтынгаў – Шанхайскі прадметны рэйтынг універсітэтаў ARWU 2017 года па фізіцы і заняў месца ў групе 401-500. Раней ніводны беларускі ўніверсітэт не ўваходзіў у дадзены рэйтынг. БДУ таксама з'яўляецца адзіным беларускім універсітэтам, прадстаўленым ва ўплывовым рэйтынгу Times Higher Education.

**Павел САЛАЎЁЎ**

НОВЫЯ ПРЫЗНАЧЭННІ

## Прарэктарам па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях прызначана доктар юрыдычных навук **Вольга Чупрыс.**



Адпаведны загад ад 09.01.2018 падпісаны рэктарам БДУ.

Чупрыс Вольга Іванаўна нарадзілася ў 1969 г. У 1992 г. скончыла юрыдычны факультэт БДУ. У 1998 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю, а ў 2010 г. – доктарскую дысертацыю на тэму «Тэарэтычныя праблемы прававога рэгулявання дзяржаўнай службы Рэспублікі Беларусь». У 2003 г. прысвоена навуковае званне дацэнта ВАК Беларусі, а ў 2016 г. – прафесара.

Працоўная дзейнасць у БДУ пачалася з 1997 г. Працавала на пасадах выкладчыка, старшыні савета па НДРС юрыдычнага факультэта, намесніка дырэктара Юрыдычнага каледжа БДУ, намесніка дэкана юрыдычнага факультэта. З 2015 па студзень 2018 г. узначальвала кафедру дзяржаўнага кіравання юрыдычнага факультэта.

Галіна навуковых інтарэсаў – выканаўчая ўлада, дзяржаўнае кіраванне, дзяржаўная служба, адміністрацыйна-прававыя рэжымы, а таксама адміністрацыйная адказнасць і адміністрацыйны працэс.

З'яўляецца членам навукова-кансультатыўных саветаў пры Міністэрстве юстыцыі Беларусі, Вярхоўным Судзе нашай краіны, пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве, пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.

Узнагароджана падзякай Міністэрства юстыцыі Беларусі (2006 г.), нагрудным знакам «Найлепшы работнік гаспадарчага суда» (2011 г.), дыпломамі конкурсу на прыз імя У. Д. Спасовіча (2013, 2015 гг.), Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі краіны (2015 г.). У 2015 годзе прызначана стыпендыя Прэзідэнта Беларусі таленавітым маладым навукоўцам.

Аўтар больш як 100 навуковых прац.

## Прарэктарам па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях прызначаны **Іван Янушэвіч.**



Адпаведны загад ад 18.01.2018 падпісаны рэктарам БДУ.

Янушэвіч Іван Іванавіч – кандыдат гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1974 г. у Гродзенскай вобласці.

У 1996 годзе скончыў гістарычны факультэт БДУ, у 1999 годзе аспірантуру РІВШ, у 2011 годзе Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Працаваў выхавальнікам у інтэрнаце № 1 БДУ; галоўным спецыялістам, намеснікам начальніка аддзела, начальнікам аддзела, начальнікам упраўлення ў апараце Цэнтральнага камітэта грамадскага аб'яднання «Беларускі патрыятычны саюз моладзі»; галоўным спецыялістам Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь; загадчыкам сектара аналітычнай працы ўпраўлення аналітычнай працы і перспектыўнага развіцця БДУ; начальнікам навукова-метадычнага аддзела РІВШ; намеснікам дэкана гуманітарнага факультэта БДУ па выхаваўчай рабоце. З лютага 2017 па студзень 2018 гг. – дэкан факультэта сацыякультурных камунікацый БДУ.

Навуковыя інтарэсы тычацца пытанняў фарміравання беларускай дзяржаўнасці і канфесійнай гісторыі Беларусі.

Аўтар каля 100 навукова-метадычных прац, у тым ліку манаграфіі, а таксама 3 навучальна-метадычных дапаможнікаў для студэнтаў і абітурыентаў. Суаўтар 4 электронных навучальна-метадычных комплексаў і 3 электронных комплексаў для тэсціравання студэнтаў завочнага аддзялення.

## Весткі з рэктарата

**ПАСАДА** прарэктара па вучэбнай рабоце, якую займае **Сяргей Ходзін,** пераназвана на пасаду прарэктара па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі. Адпаведны загад 09.01.2018 падпісаны рэктарам БДУ.

* * *

**СТЫПЕНДЫ** Прэзідэнта Беларусі на 2018 год прызначаны 12 аспірантам БДУ. У іх ліку: **Сяргей Бондараў** (ММФ), **Сяргей Гардзійчук** (гістарычны факультэт), **Ірына Клімовіч, Антон Марцінаў** (ФРКТ), **Ніна Літвінка** (геаграфічны факультэт), **Дзмітрый Ніканові** (Інстытут журналістыкі), **Ілья Сульжыцкі** (ФФСН), **Вольга Смольская** (біялагічны факультэт), **Наталля Шандора** (эканамічны факультэт), **Ірына Шахноўская** (юрыдычны факультэт), **Канстанцін Шых** (ФМА), **Ганна Янкута** (філалагічны факультэт).

* * *

**РАСПРАЦАВАНАЯ** РУП «Унітэхпрам» БДУ **«Фітасоль»** прызнана Найлепшым таварам Беларусі ў 2017 г. Фітасоль харчовай дыетычнай серыі «Універсум» з паніжаным утрыманнем хлорыстага натрыю стала пераможцам у намінацыі «Харчовыя тавары» конкурсу «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь–2017». Таксама распрацоўцы вучоных БДУ прысуджаны статус «Навінка года».

Фітасоль дазваляе паменшыць залішняе спажыванне чалавекам кухоннай солі.

Пры падвядзенні вынікаў конкурсу рэспубліканская конкурсная камісія ўлічвае водгукі спажыўцоў, якія паступілі ў адносінах да арганізацый-фіналістаў, іх прадукцыі і паслуг.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

ВАЖНЫЯ РАШЭННІ




# У цэнтры ўвагі аплата працы і ўдасканаленне зместу адукацыі

**У БДУ прайшло пашыранае пасяджэнне рэктарата з удзелам дэканаў, дырэктараў навучальных, навукова-даследчых інстытутаў і кіраўнікоў структурных падраздзяленняў. На парадак дня былі вынесены пытанні, якія тычацца функцыянальных абавязкаў прарэктараў, аплаты працы кіраўнікоў структурных падраздзяленняў комплексу БДУ і выканання працоўнай дысцыпліны.**

«Правядзенне рэктарата ў такім складзе абумоўлена неабходнасцю абмеркавання атрыманых вынікаў пры аналізе адміністрацыйнай, фінансава-эканамічнай працы БДУ і зацвярджэння асноўных напрамкаў дзейнасці ВНУ», – адзначыў рэктар **Андрэй Кароль.**

## ЗМЯНЕННЕ ФУНКЦЫЯНАЛУ ПРАРЭКТАРАЎ І ДЭКАНАЎ

Уважлівы аналіз абавязкаў прарэктараў, дэканаў і Галоўнага ўпраўлення вучэбна-метадычнай работы выявіў дубляванне функцыі кіраўнікоў. «Гэта памнажае бюракратызм у кіраўнічым працэсе і зводзіць ролю прарэктараў на тэхнічны ўзровень. Для ўстойлівага развіцця неабходна ўжо запускаць магутную «турбіну», якая прывяла б у рух увесь універсітэт», – падкрэсліў рэктар. Для таго, каб пазбегнуць падобных роляў, функцыянал прарэктараў па вучэбных пытаннях ужо скарэктаваны і пераарыентаваны на актуальныя напрамкі дзейнасці БДУ. У сувязі з гэтым уведзены пасады прарэктара па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях і прарэктара па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі, на якія прызначаны прафесары Вольга Іванаўна Чупрыс і Сяргей Мікалаевіч Ходзін адпаведна.

З прычыны перагляду функцыяналу прарэктараў зменіцца і функцыянал дэканаў. Павялічыцца іх роля ў якасці кіраўнікоў, што запатрабуе карэкціроўкі службовых інструкцый і пастаўленых задач. Іх рашэнне абумоўлена засяроджанасцю на актуальных пытаннях, якія існуюць сёння ва ўніверсітэце. Яны заключаюцца ў праектаванні і арганізацыі адукацыйных працэсаў на 1 і 2 ступенях, удасканаленні стандартаў адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, укараненні інавацыйных методык навучання, інтэрнацыяналізацыі адукацыі, экспарце адукацыйных паслуг і працы з замоўцамі. Узнікненне гэтых пытанняў абумоўлена некаторымі статыстычнымі дадзенымі, прыведзенымі рэктарам Андрэем Каралём. У іх ліку звесткі па значным адлічэнні студэнтаў. Адну з прычын гэтага рэктар бачыць у фармалізаваным падыходзе выкладчыка да навучання. «Пад прэстыжнасцю любога ўніверсітэта трэба разумець яго прывабнасць для студэнта. А гэта тое, наколькі мы прадстаўляем маладым людзям магчымасць выявіць, раскрыць і рэалізаваць свой патэнцыял. А трансляцыяй розным студэнтам аднолькавай, «правільнай» і «гатовай» інфармацыі гэтага дасягнуць нельга. Ці навучаем мы іх ствараць сконачаны адукацыйны прадукт, уцягваючы ў даследчую і творчую дзейнасць? Адказы звязаны, галоўным чынам, са зменай метадалогіі, зместу навучання на ўзроўні стандартаў і навучальных праграм, крытэрыяў ацэньвання, выбарам прадуктыўных формаў і метадаў навучання. І тут асаблівую ролю павінен сыграць РІВШ, які ўваходзіць у склад БДУ», – падкрэсліў Андрэй Кароль.

Адкрытым таксама застаецца пытанне экспарту адукацыйных паслуг. У 2017 годзе план экспарту паслуг быў выкананы толькі на 82 %. «Гэты інтэгральны паказчык эфектыўнасці працы ВНУ прымушае задумацца. Таму ракурс на інтэрнацыяналізацыю абраны невыпадкова», – адзначыў рэктар.

## УЗМАЦНЕННЕ ПРАЦЫ З ЗАМОЎЦАМІ КАДРАЎ

Таксама на пасяджэнні рэктарата абмяркоўвалася схема працы ўніверсітэта з замоўцамі кадраў. «Мы бачым, што гэты працэс недасканалы. Неабходна выбудоўваць бесперапынны ланцужок: ад замовы спецыяліста арганізацыямі да яго працаўладкавання. Сёння гэты працэс перарываецца, і часта таму, што выпускаючыя кафедры і факультэты не надаюць належнай увагі працы з замоўцамі і пытанням размеркавання», – пракаментаваў Андрэй Кароль. Кіраўніцтва ВНУ мае намер узмацніць працу па ўзаемадзеянні з замоўцам кадраў, што адаб'ецца і на магчымасцях фінансавання ўніверсітэта.

На рэктараце таксама падкрэслілі, што сёння актуальнай сітуацыяй для БДУ з'яўляецца дзейнасць ва ўмовах павышанай канкурэнцыі за абітурыента. Яна патрабуе змен у падыходах прафарыентацыйнай працы, кансалідацыі намаганняў факультэтаў, прыёмнай камісіі і ўдасканалення ў даўніверсітэцкім сегменце.

## НОВЫЯ ПРЫНЦЫПЫ НАЛІЧЭННЯ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ

Пры разглядзе пытання аплаты працы кіраўнікоў структурных падраздзяленняў (рэктара, прарэктараў, дэканаў факультэтаў і дырэктараў інстытутаў) комплексу БДУ рэктар Андрэй Кароль вылучыў асноўны тэзіс у рэгуляванні дадзенай сістэмы: «Не атрымліваць грошы, а зарабляць іх. Неабходна ўзмацніць пазабюджэтную дзейнасць падраздзяленняў».

На рэктараце былі агучаны новыя прынцыпы налічэння заработнай платы. Яны грунтуюцца на ўважлівым, працяглым і глыбокім аналізе папярэдняй схемы яе разліку. У прыватнасці, былі прааналізаваны прыбыткі рэктарата, дэканаў, дырэктараў інстытутаў, начальнікаў галоўных упраўленняў і ўпраўленняў за студзень–лістапад 2017 года. У шэрагу выпадкаў аналіз паказаў значныя складнікі аплаты працы некаторых кіраўнікоў як за кошт іх удзелу ў ЧНК (часовы навуковы калектыў) і праектах міжнароднай тэхнічнай дапамогі (МТД), так і атрыманне прэмій з розных крыніц. У сувязі з гэтым было дадзена даручэнне прарэктару па навуковай рабоце Васілю Сафонаву праверыць сумесна з дэканамі біялагічнага факультэта і ФРКТ якасць навуковых адкрыццяў, якія фінансуюцца па ЧНК і выконваюцца на гэтых факультэтах.

Было адзначана, што падобнае пераважанне дадатковых выплат дэматывуе на выкананне кіраўніком асабліва адміністрацыйных функцый і на рэалізацыю стратэгічных мэт факультэтаў і інстытутаў.

Таму ў БДУ распрацавана новая схема фарміравання аплаты працы кіраўніка, дзеянне якой ажыццяўляецца са студзеня бягучага года. Усталяваны лімітавыя і максімальныя ўзроўні аплаты адміністрацыйнай працы кіраўнікоў. Дадаткова магчымае выкананне прац па сумяшчальніцтве (ПВС ці навуковага супрацоўніка) да 0,5 стаўкі. І ўпершыню са студзеня 2018 года кіраўнік зможа зарабіць да 10 % сродкаў ад ФАП (фонду аплаты працы), атрыманых у выніку дадатковай пазабюджэтнай дзейнасці падраздзялення.

«Зарплата дэканаў факультэтаў і дырэктараў інстытутаў будзе залежаць у тым ліку ад колькасці студэнтаў, колькасці адукацыйных праграм на першай і другой ступенях, і асабліва ад ліку праграм на англійскай мове, замежных навучэнцаў і экспарту паслуг», – дадаў рэктар.

Адным з ключавых момантаў сістэмы аплаты працы з'яўляюцца рэкамендацыі кіраўніку «паспець» якасна выканаць адміністрацыйныя функцыі, што зробіць малапрадуктыўным яго ўдзел у ЧНК па тэмах, фундаваных з бюджэту.

З лістапада 2017 года на факультэты для дадатковага заахвочвання ПВС на аснове рэйтынгу ўжо вылучаны сродкі ў памеры 12,5 % ад пазабюджэтнага прыбытку. Дэкан факультэта сумесна з загадчыкамі кафедраў вызначаюць памеры заахвочвання для найлепшых выкладчыкаў. Размеркаванне гэтага дадатковага прэміяльнага фонду на факультэтах рэкамендавана зрабіць максімальна адкрытым для ўсіх загадчыкаў кафедраў і кіраўніцтва факультэтаў.

Са студзеня 2018 года ў БДУ таксама будуць усталяваны імянныя штомесячныя прэміі ў памеры 150 рублёў для выкладчыка па выніках яго працы за папярэдні каляндарны год. Колькасць вылучаных прэмій на факультэт складае ад трох да дзесяці і вызначаецца колькасцю студэнтаў на факультэце.

«У дачыненні аплаты працы працаўнікоў і начальнікаў упраўленняў з мэтай аптымізацыі і дэбюракратызацыі ў выдаткоўванні прэміяльнага фонду, выключэнні шматразовага прэміявання ў адным каляндарным месяцы для кожнага адміністрацыйнага падраздзялення распрацаваны крытэрыі эфектыўнасці працы (каэфіцыенты), паводле якіх на кожнае падраздзяленне будуць вылучацца матэрыяльныя сродкі. Кіраўнік упраўлення, напрыклад, зможа прэміяваць раз у месяц кожнага свайго супрацоўніка зыходзячы з вынікаў яго працы. А кіраўніка будзе прэміяваць агульнаўніверсітэцкая камісія на чале з першым прарэктарам», – адзначыў рэктар Андрэй Кароль.

## ПАТРАБАВАННІ ПРАЦОЎНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Пытанне працоўнай дысцыпліны на пашыраным рэктарацы прадставіла начальнік упраўлення кадраў Наталля Няпеўная. Яна адзначыла неабходнасць выканання ўсімі супрацоўнікамі правіл працоўнай і выканальніцкай дысцыпліны. Асноўнымі патрабаваннямі да структурных падраздзяленняў з'яўляюцца: наяўнасць у іх журналаў уліку працоўнага часу (акрамя ПВС), складзенага графіка працы загадчыкаў кафедраў, плана камандзіровачных паездак, а таксама спланаванага графіка працоўных адпачынкаў. Было падкрэслена, што кожны загадчык кафедры павінен «эфектыўна выкарыстоўваць працоўны час кіраўніка» з мэтай перспектыўнага развіцця сваёй структуры.

Наталля Няпеўная таксама праінфармавала прысутных, што са студзеня бягучага года аднаўляюцца аплачваныя дзяжурствы па рэктарацы кіраўнічага складу БДУ ў выходныя і святочныя дні.

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

# Створана камісія па прэміяванні

**Створана камісія па прэміяванні кіраўнікоў комплексу БДУ. Адпаведны загад падпісаў 18 студзеня рэктар БДУ Андрэй Кароль.**

Дзейнасць камісіі накіравана на ўзмацненне стымулюючай ролі прэміі кіраўнікоў у павышэнні эфектыўнасці, выніковасці працы комплексу БДУ і выкананні прынцыпаў сацыяльнай справядлівасці. У прыватнасці, за новым органам замацаваны функцыі галоснага вызначэння памераў прэміі кіраўнікам па распрацаваных крытэрыях.

Старшынёй камісіі прызначаны першы прарэктар БДУ акадэмік **Алег Івашкевіч,** яго намеснікам — прарэктар па эканоміцы і матэрыяльна-тэхнічным развіцці **Міхаіл Чарапеннікаў.** У яе складзе таксама: прарэктар па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях **Вольга Чупрыс,** прарэктар па вучэбнай рабоце і інтэрнацыяналізацыі адукацыі **Сяргей Ходзін,** прарэктар па навуковай рабоце **Васіль Сафонаў,** прарэктар па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях **Іван Янушэвіч,** дырэктар ДІКСТ БДУ **Пётр Брыгадзін,** дэкан біялагічнага факультэта **Уладзімір Лысак,** загадчык кафедры міжнародных эканамічных адносін ФМА **Наталля Юрава,** загадчык кафедры інтэлектуальных сістэм факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій **Канстанцін Казадаеў** і начальнік упраўлення кадраў **Наталля Няпеўная.**

Першае пасяджэнне камісіі прайшло 19 студзеня пры ўдзеле рэктара БДУ.




Фота Васіля КУЗЬМІЧОНКА

# Узнагароды супрацоўнікам БДУ да Дня беларускай навукі

Сумеснае пасяджэнне Савета і Вучонага савета БДУ, прысвечанае Дню беларускай навукі, адбылося 22 студзеня.

Прарэктар па навуковай рабоце **Васіль Сафонаў** прадставіў даклад «БДУ ў Год навукі–2017: падзеі, дасягненні, перспектывы развіцця». Сярод асноўных пытанняў разглядаліся справаздачы атрымальнікаў грантаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2017 года ў навуцы, стварэнне савета па абароне дысертацый па юрыдычных навуках, адкрыццё падрыхтоўкі ў БДУ на II ступені вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях «Медыякамунікацыі» і «Менеджмент масавых падзейных мерапрыемстваў», а таксама прадстаўленне да дзяржаўных узнагарод супрацоўнікаў БДУ.

На ўрачыстай цырымоніі 17 супрацоўнікаў нашага ўніверсітэта былі адзначаны Міністэрствам адукацыі Беларусі, а 19 – Беларускім дзяржаўным універсітэтам.

*Нагруднага знака «Выдатнік адукацыі»* Міністэрства адукацыі ганараваны супрацоўнікі БДУ. Узнагарода ўручана прарэктару па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях **Вользе Чупрыс** і прафесару кафедры сацыялогіі факультэта філасофіі і сацыяльных навук **Анатолю Рубанаву.**

*Ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі* ўзнагароджаны: загадчык лабараторыі прыкладной электрадынамікі Інстытута прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі БДУ **Анатоль Будай,** загадчык кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта **Ігар Грунтоў,** прафесар кафедры этналогіі, музеалогі і гісторыі мастацтва гістарычнага факультэта **Аляксандр Гужалоўскі,** прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта **Таісія Доўнар,** загадчык кафедры фінансавага права і прававога рэгулявання гаспадарчай дзейнасці юрыдычнага факультэта **Віктар Камянкоў,** дацэнт кафедры матэматычнай кібернетыкі механіка-матэматычнага факультэта **Юрый Мяцельскі,** загадчык кафедры тэхналогій камунікацый Інстытута журналістыкі **Ірына Сідорская.**

*Грамат Міністэрства адукацыі* ганараваны: загадчык лабараторыі хіміі кандэнсаваных асяроддзяў Навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем **Юрый Грыгор'еў,** дацэнт кафедры інжынернай геалогіі і геафізікі геаграфічнага факультэта **Алег Лукашоў,** загадчык лабараторыі фізікі атмасферы Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы **Аляксандр Людчык,** навуковы супрацоўнік лабараторыі нанаэлектрамагнетызму Інстытута ядзерных праблем **Арцём Плюшч,** навуковы супрацоўнік лабараторыі радыёфізічных даследаванняў гэтай жа ўстановы **Надзея Пушкіна,** загадчык кафедры электрахіміі хімічнага факультэта **Яўген Стральцоў,** дацэнт кафедры вылічальнай матэматыкі факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі **Аляксандр Цецераў,** начальнік аддзела суправаджэння інавацыйнай дзейнасці і аховы інтэлектуальнай уласнасці Галоўнага ўпраўлення навукі **Леанід Шуваеў.**

*Падзяка рэктара БДУ* з уручэннем каштоўнага падарунка абвешчана дзевяці супрацоўнікам і выкладчыкам універсітэта. Сярод узнагароджаных: старшы выкладчык кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў **Людміла Бізюк,** вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі моцнатокавай электронікі НДУ «Інстытут ядзерных праблем» БДУ **Аляксандра Гурыновіч,** дацэнт кафедры экалагічнага і аграрнага права юрыдычнага факультэта **Альберт Жлоба,** намеснік дэкана факультэта журналістыкі **Наталля Зубчонак,** рэдактар аддзела навуковых перыядычных выданняў упраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы **Алена Паўлава,** дацэнт кафедры фізікі цвёрдага цела фізічнага факультэта **Наталля Паляк,** начальнік аддзела вэб-праектаў і стратэгічных камунікацый Медыяцэнтра **Юрый Пазняк,** прафесар кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі **Анатоль Сманцэр,** дырэктар Навукова-даследчага інстытута прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі **Юрый Харын.**

Падзяка рэктара БДУ абвешчана за добрасумленную працу, вялікі ўнёсак у развіццё і забеспячэнне навучальнага працэсу ВНУ.

*Ганаровае званне «Заслужаны работнік БДУ»* прысвоена 10 выкладчыкам і супрацоўнікам ВНУ.

Сярод узнагароджаных: прафесар кафедры тэорыі функцый механіка-матэматычнага факультэта **Наталля Броўка,** загадчык навукова-даследчай лабараторыі возеразнаўства геаграфічнага факультэта **Барыс Уласаў,** загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання факультэта журналістыкі Інстытута журналістыкі БДУ **Віктар Іўчанкаў,** дэкан гістарычнага факультэта **Аляксандр Каханоўскі,** загадчык кафедры вышэйшай матэматыкі факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі **Сяргей Мазанік,** загадчык лабараторыі інфармацыйна-вымяральных сістэм НДУ «Інстытут прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі» БДУ **Анатоль Раманаў,** загадчык кафедры фізікі і аэракасмічных тэхналогій факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій **Уладзімір Саечнікаў,** вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі хіміі тонкіх плёнак установы БДУ «Навукова-даследчы інстытут фізіка-хімічных праблем» **Людміла Цыбульская,** прафесар кафедры клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін біялагічнага факультэта **Уладзімір Юрын,** намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення навукі **Алег Янкоўскі.**

Званне «Заслужаны работнік» прысвойваецца супрацоўнікам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта за шматгадовую добрасумленную працу і вялікі асабісты ўнёсак у развіццё ВНУ.

**Ульяна МІНЧАНКА**

## НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

**02 лютага Талочка Марыян Эдуардавіч,** дацэнт кафедры тэорыі функцыі, механіка-матэматычны факультэт

**04 лютага Афанасьеў Генадзь Канстанцінавіч,** дацэнт кафедры інфарматыкі і камп'ютарных сістэм, факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій

**07 лютага Юрын Уладзімір Міхайлавіч,** прафесар кафедры клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін, біялагічны факультэт

**08 лютага Ксенафонтава Наталля Міхайлаўна,** вядучы навуковы супрацоўнік НДЛ нелінейнай оптыкі і спектраскапіі кафедры лазернай фізікі і спектраскапіі, фізічны факультэт

**08 лютага Ягорава Наталля Анатольеўна,** дацэнт кафедры англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, кафедра англійскай мовы гуманітарных факультэтаў

**13 лютага Русецкі Міхаіл Серафімавіч,** старшы навуковы супрацоўнік НДЛ высокаэнергетычнай іоннай імплантацыі і функцыянальнай дыягностыкі, фізічны факультэт

**16 лютага Максімава Наталля Паўлаўна,** загадчык кафедры генетыкі, біялагічны факультэт

**17 лютага Рубанаў Анатоль Уладзіміравіч,** прафесар кафедры сацыялогіі, факультэт філасофіі і сацыяльных навук

**19 лютага Гагіна Наталля Уладзіміраўна,** дацэнт кафедры геаграфічнай экалогіі, геаграфічны факультэт

**20 лютага Ільіна Наталля Андрэеўна,** дацэнт кафедры арганічнай хіміі, хімічны факультэт

**20 лютага Грыгаровіч Васіль Леанідавіч,** дацэнт кафедры крыміналістыкі, юрыдычны факультэт

**23 лютага Дзямідчык Валерый Іосіфавіч,** дацэнт кафедры радыёфізікі і лічбавых медыятэхналогій, факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій

**23 лютага Труш Мікалай Мікалаевіч,** загадчык кафедры тэорыі верагоднасцяў і матэматычнай статыстыкі, факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі

**28 лютага Бобр Аляксандр Міхайлавіч,** дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі, факультэт філасофіі і сацыяльных навук

## АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: эканамічнай тэорыі; тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі; германскіх моў; батанікі; малекулярнай біялогіі; інфарматыкі і камп'ютарных сістэм; квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі; вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі; тэхналогій праграмавання;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду; грамадзянскага працэсу і працоўнага права; агульнага землязнаўства і гідраметэаралогіі; тэорыі імавернасцяў і матэматычнай статыстыкі; дыферэнцыяльных ураўненняў і сістэмнага аналізу; тэарэтычнай фізікі і астрафізікі;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў; гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу; міжнароднага менеджменту; тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі; міжнароднага права; германскіх моў; грамадзянскага права; тэорыі і гісторыі дзяржавы і права; канстытуцыйнага права; крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду; крымінальнага права; гісторыі беларускай літаратуры; філасофіі культуры; клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін; фізіялогіі чалавека і жывёл; мікрабіялогіі; глебазнаўства і зямельных інфармацыйных сістэм; эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі; геаграфічнай экалогіі; фізічнай геаграфіі свету і адукацыйных тэхналогій; гісторыі журналістыкі і менеджменту СМІ; замежнай журналістыкі і літаратуры; стылістыкі і літаратурнага рэдагавання; вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання; агульнай фізікі; тэхналогій праграмавання;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: этналогіі, музеалогіі і гісторыі мастацтваў; англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў; раманскіх моў; тэорыі і гісторыі дзяржавы і права; геадэзіі і картаграфіі; эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі; замежнай журналістыкі і літаратуры; неарганічнай хіміі; фізічнай электронікі і нанатэхналогій;

АСІСТЭНТА КАФЕДРЫ: біямедыцынскай інфарматыкі.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы. Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

**УА «ІНСТЫТУТ ПЕРАПАДРЫХТОЎКІ І ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ СУДДЗЯЎ, РАБОТНІКАЎ ПРАКУРАТУРЫ, СУДОЎ І ЎСТАНОЎ ЮСТЫЦЫІ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА»**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ:**

ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ пракурорскай дзейнасці.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Савецкая, д. 14, каб. 315. Тэл. 327 40 56.*

**НДІ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А. Н. СЕЎЧАНКІ**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ**

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА лабараторыі фізіка-хіміі палімерных матэрыялаў і прыродных арганічных злучэнняў па спецыяльнасці 01.04.05 (оптыка).

*Тэрмін конкурсу – месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: г. Мінск, ул. Курчатава, 7. Тэл. 212-48-43.*

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Інтэрв'ю рэктара БДУ Андрэя Караля «В работающем знании – наша сила»** – «СБ. Беларусь сёння», sb.by (04.01).

**БДУ ўпершыню ўвайшоў у 500 найлепшых універсітэтаў у сусветным рэйтынгу Webometrics** – sputnik.by, БелТА, tut.by, naviny.by, БелаПАН, sb.by, telegraf.by, mail.ru, «Мінск-навіны» (25.01), zviazda.by, «Звязда» (27.01).

**Біяпрэпарат «Субмасцін-КРС» для эфектыўнай прафілактыкі і лячэнні субклінічнага мастыту кароў падчас лактацыі распрацаваны ў БДУ** – БелТА, interfax.by, zviazda.by, agronews.com, wuz.by, newspdd.ru, ecopress.by (04.01), zviazda.by (06.01).

**Навучальна-метадычны дапаможнік «Методыка навучання кітайскаму іерагліфічнаму пісьму», аўтарам якога выступіла дацэнт кафедры кітайскай філалогіі філалагічнага факультэта ВНУ Юлія Малаткова, выдадзены ў БДУ** – wuz.by, belarus.by, БелТА (05.01), «Мінск-навіны» (08.01), БТ-1 (17.01).

**Ліцэй БДУ запусціў анлайн-краму адукацыйных матэрыялаў для абітурыентаў** – «Камсамольская праўда ў Беларусі», БелТА, «Мінск-навіны» (16.01), ecopress.by, wuz.by (19.01), zviazda.by(20.01).

**У РНПЦ оталарынгалогіі праводзяць аперацыі па паляпшэнні слыху з выкарыстаннем матэматычнай мадэлі, распрацаванай навукоўцамі БДУ** – ecopress.by (18.01), БелТА, wuz.by (19.01), СТБ (22.01).

**Ліцэісты БДУ заваявалі восем медалёў на XIV Міжнароднай Жаўтыкаўскай алімпіядзе школьнікаў па матэматыцы, фізіцы і інфарматыцы** – БелТА (16.01), edu.gov.by (17.01), zviazda.by, «Звязда» (20.01), «Настаўніцкая газета» (23.01).

**Спартыўна-аздараўленчае мерапрыемства «Вакацыі ў Лагойску» прайшло 25 студзеня ў БДУ** – БелТА (23.01), zviazda.by (24.01), БТ-1, СТБ, АНТ, sputnik.by, wuz.by (25.01), mvradio.by, rg.ru, 1prof.by (26.01).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УСТАНОВЫ

# Дарожная карта для РІК імя Канфуцыя

Пытанні далейшага развіцця Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ былі разгледжаны ў рамках працоўнага візіту рэктара Андрэя КАРАЛЯ ва ўстанову.




Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

Адбылася сустрэча з дырэктарам РІКК БДУ **Анатолем Тозікам**, яго намеснікамі **Вячаславам Лявонавым** і **Сун Яньвэй**. Удзельнікамі мерапрыемства таксама сталі першы прарэктар **Алег Івашкевіч**, прарэктар па навучальнай рабоце і адукацыйных інавацыях **Вольга Чупрыс**, прарэктар па эканоміцы і матэрыяльна-тэхнічным развіцці **Міхаіл Чарапеннікаў**, памочнік рэктара **Юрый Сіверцаў** і дацэнт РІКК **Юлія Малаткова**. Дадзены візіт быў абумоўлены неабходнасцю абмеркавання актуальных пытанняў, якія тычацца бягучага стану інстытута, фарміравання яго стратэгічных мэт і далейшага развіцця.

Рэктар БДУ Андрэй Кароль адзначыў: *«З улікам росту запатрабаванасці кітайскай мовы ў краіне, павелічэння ліку ахвотнікаў яе вывучаць, узмацнення ролі самога РІКК у Беларусі, што выконвае функцыі каардынатара ў дачыненні да іншых інстытутаў Канфуцыя і класаў, трэба старанна прапрацаваць мэты для найбліжэйшых, сярэднетэрміновых і далёкатэрміновых перспектыў інстытута»*.

У 2017 годзе РІКК выйшаў на ўстойлівае самафінансаванне. Анатоль Тозік адзначыў: *«Мы склалі тры дамовы аб супрацоўніцтве з кітайскімі арганізацыямі. Сёння ўзрастае цікавасць да вывучэння кітайскай мовы, і мы маем запатрабаванасць па аказанні адукацыйных паслуг, а школы не ў стане гэтую патрэбу задаволіць. Мы выйшлі на ўстойлівае самафінансаванне і пры вырашэнні пэўных праблем зможам зарабляць значна больш»*.

Стан матэрыяльна-тэхнічнай базы РІКК БДУ стаў адной з галоўных тэм абмеркавання. У прыватнасці, гаворка ішла пра аптымізацыю і выкананне тэрмінаў рамонтных прац аднаго з адміністрацыйных будынкаў БДУ, вылучаных РІКК. Плануецца, што мадэрнізаваны будынак будзе абсталяваны аўдыякласамі, бібліятэкай з вялікім фондам кітайскай літаратуры і падручнікаў, сучаснымі навучальнымі аўдыторыямі. Своечасовы ўвод у эксплуатацыю адрамантаванага корпуса дазволіць павялічыць колькасць слухачоў і ўзмацніць працу ў інстытуце па новых напрамках. Так, на сустрэчы было падкрэслена, што ў краіне востра адчуваецца недахоп кітаязнаўцаў, спецыялістаў, якія валодаюць не толькі кітайскай мовай, але дасведчаных у эканоміцы, культуры, традыцыях і магчымасцях Кітая для нашай краіны. *«Хочам стварыць буйны нацыянальны цэнтр па вывучэнні Кітая на базе РІКК, што дазволіць пашырыць пералік паслуг і відаў яго дзейнасці. Разумеем, што гэта складана, але пачынаць прыцягваць спецыялістаў для гэтай працы неабходна ўжо цяпер»*, – падзяліўся сваімі планамі Анатоль Тозік. Таму адмысловая ўвага на працоўнай сустрэчы была нададзена змястоўнаму аспекту дзейнасці інстытута.

Прынята рашэнне хуткім часам падрыхтаваць «дарожную карту» далейшага руху інстытута. *«Складзіце, калі ласка, працоўны дакумент, дзе пазначыце стратэгічныя мэты, механізмы іх рашэння, выніковы прадукт дзейнасці, з указаннем тэрмінаў, фінансавых і іншых рэсурсаў для дасягнення дарожнай карты, а таксама адказных асобаў на кожным этапе выканання»*, – звярнуўся рэктар Андрэй Кароль да кіраўніцтва РІКК.

Таксама ў рамках мерапрыемства была паднята праблема, якая тычыцца дзейнасці ўсіх структур БДУ. Гаворка ішла пра досыць складаны працэс узгаднення дакументаў па розных пытаннях. Прарэктару па эканоміцы і матэрыяльна-тэхнічным развіцці было дадзена даручэнне на працягу тыдня распрацаваць спрошчаную схему працэсу закупак тавараў. «Неабходна дэбюракратызаваць дадзены працэс: прыбраць фармалізаваныя падыходы. Узгадненне дакументаў для супрацоўніка павінна скончыцца ў адным кабінеце», – рэзюмаваў Андрэй Кароль. У пераліку абмеркаваных тэм было наданне РІКК статусу юрыдычнай асобы. Кіраўніцтва БДУ падкрэсліла, што канцэптуальна гэта пытанне ляжыць у плоскасці агульнага развіцця адукацыйных структур БДУ. Хуткім часам будзе прапрацавана структура БДУ з мэтай змены функцыяналу і арыентацыі на працэснае, а не тэхнічнае кіраванне ВНУ.

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

ВЫДАВЕЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

# Часопісы БДУ.

Ужо год 14 навуковых часопісаў БДУ выходзяць у новым фармаце, а ў канцы 2017 г., 29 снежня, часопісы займелі сайты (інфармацыя загружаецца на дзвюх мовах – рускай і англійскай). З 2018 г. уводзіцца ў дзеянне электронная рэдакцыя.




Для прасоўвання навуковых перыядычных выданняў БДУ ў базы даных Scopus і Web of Science былі ўпарадкаваны і сістэматызаваны ўсе навуковыя напрамкі, выключана дубляванне раздзелаў у часопісах і зборніках БДУ. У 2017 г. на базе «Весніка БДУ» створаны **«Часопіс БДУ»** па 14 навуковых напрамках (***journals.bsu.by***): «Біялогія», «Геаграфія. Геалогія», «Журналістыка. Педагогіка», «Гісторыя», «Матэматыка. Інфарматыка», «Міжнародныя адносіны», «Права», «Сацыялогія», «Фізіка», «Філалогія», «Філасофія. Псіхалогія», «Хімія», «Экалогія», «Эканоміка». З 2017 г. упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы рыхтуе 36 нумароў навуковых часопісаў (да 2016 г. – 16 нумароў), арганізуе і кантралюе працу 14 сайтаў навуковых часопісаў БДУ.

Каб забяспечыць адпаведнасць часопісаў сусветнаму ўзроўню навуковых публікацый, зменена афармленне, распрацаваны правілы для аўтараў, парадак рэцэнзавання, мэты і задачы, палітыка і публікацыйная этыка часопісаў, павышаны ўзровень рэдакцыйна-выдавецкай падрыхтоўкі навуковых публікацый (асаблівая ўвага надаецца апрацоўцы метаданых, старанна правяраюцца бібліяграфічныя спісы, што важна для прадстаўлення інфармацыі ў электронных базах даных).

У сувязі з рэарганізацыяй выданне прайшло перарэгістрацыю ў Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Беларусі, Навуковай электроннай бібліятэцы (Расія, РІНЦ), Міжнародным цэнтры перыядычных выданняў у Парыжы (ISSN-цэнтр). Былі заключаны дамовы на новыя выданні з РУП «Белпошта» і РУП «Белсаюздрук», Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, электронна-бібліятэчнай сістэмай выдавецтва «Лань».

Паколькі ўпраўленню была пастаўлена задача асвоіць сістэму электроннай рэдакцыі і ўкараніць яе ў працу рэдкалегіі, з 2018 г. для 14 назваў выдання «Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта» запушчана і працуе сістэма электроннай рэдакцыі артыкула, г. зн. аўтары падаюць артыкулы праз сайт, працэсы рэцэнзавання, літаратурнага рэдагавання артыкулаў, а таксама публікацыя ажыццяўляюцца на сайце. Цяпер упраўленне кансультуе рэдкалегіі, аўтараў па рабоце электроннай рэдакцыі, дапамагае размяшчаць матэрыялы на сайце і адпраўляць іх на рэцэнзаванне.

Найбольш паспяховае авалоданне сістэмай электроннай рэдакцыі адзначаецца па наступных навуковых напрамках: эканоміка, геаграфія, біялогія, гісторыя. Рэдкалегіі гэтых навуковых напрамкаў актыўна ўклю-

# Фундаментальная навука прыносіць прыбытак

НДІ ядзерных праблем БДУ вось ужо больш за 30 гадоў займаецца фундаментальнымі распрацоўкамі. Дырэктар установы Сяргей МАКСІМЕНКА распавёў пра важныя вынікі інстытута за мінулы год і пра ролю фундаментальнай навукі ў ВНУ і дзяржаве.



Фота Васіля КУЗЬМІЧОНКА

## Удзел у праграмах і калабарацыях

Сярод навуковых напрамкаў інстытута можна вылучыць: узаемадзеянне выпраменьванняў з рэчывам, ядзерная фізіка, фізіка часціц і высокіх энергій, электрамагнетызм складаных асяроддзяў, кантроль малых доз радыяцыі і радыёактыўнага забруджвання і іншыя.

У структуру інстытута ўваходзяць 9 лабараторый, а таксама Цэнтр фізікі часціц і высокіх энергій, у якім яшчэ 3 лабараторыі. Тут задзейнічана 138 супрацоўнікаў, сярод іх 80 навукоўцаў.

Паводле рэйтынгаў арганізацый Беларусі на падставе індэкса Хірша, што характарызуе колькасць публікацый і іх цытавання, НДІ ЯП БДУ займае пазіцыі лідара. Бо 12 супрацоўнікаў інстытута маюць паказчык вышэйшы за 15.

– Інстытут супрацоўнічае з вялікай колькасцю арганізацый, удзельнічае ў шматлікіх дзяржаўных і замежных праектах, – кажа дырэктар. – Напрыклад, Дзяржаўныя праграмы навуковых даследаванняў, Рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і іншыя. Таксама вылучаюцца Аб’яднаны інстытут ядзерных даследаванняў (Дубна, Расія), ЦЕРН – Еўрапейскі Цэнтр ядзерных даследаванняў – найбуйнейшая ў свеце лабараторыя фізікі высокіх энергій. Варта згадаць і праекты праграмы Еўрапейскага саюза па развіцці навуковых даследаванняў і тэхналогій «Гарызонт 2020» і еўрапейскі мегагрант Graphene Flagship, у якім НДІ ЯП з’яўляецца адзінай навуковай арганізацыяй за межамі ЕС.

Інстытут удзельнічае ў працы найбуйнейшых міжнародных калабарацый у галіне фізікі высокіх энергій: EDM Collaboration (ЗША), PANDA (Германія), COSY (Германія), LAPP (Францыя).

За апошнія гады супрацоўнікамі НДІ ЯП атрыманы важныя вынікі ў фундаментальных і прыкладных даследаваннях. Сярод іх вылучаецца ўдзел навукоўцаў інстытута ў эксперыментах CMS на Вялікім адронным калайдары ў ЦЕРН, якія прывялі да адкрыцця базона Хігса. 14 супрацоўнікаў інстытута былі суаўтарамі першых прац, якія паведамляюць пра гэта адкрыццё. Варта таксама адзначыць цыкл прац па сінтэзе шматпластовых графен-палімерных пакрыццяў.

## Неабходнасць фундаментальнай навукі

Як падкрэслівае Сяргей Максіменка, асновай паспяховай працы інстытута з’яўляецца высокі ўзровень фундаментальных даследаванняў, хоць яны далёка не заўсёды прыносяць відавочную і хуткую аддачу. Фундаментальная навука – гэта капітал, які мы ўкладваем у будучыню. Без гэтага капіталу складана сабе ўявіць развіццё тэхналогій, не менш важнай з’яўляецца яго роля ў развіцці адукацыі.

– Імгненную аддачу дае інжынерыя, – разважае дырэктар інстытута. – А фундаментальная навука дае перспектыўныя распрацоўкі, якія калі і акупяцца, то праз вялікі прамежак часу. Але калі не ўкладваць сродкі ў фундаментальную навуку, мы загадзя асуджаныя на тэхналагічнае адставанне і правінцыйнасць нацыянальнай навукова-тэхнічнай эліты.

Менавіта дзякуючы высокаму ўзроўню фундаментальных даследаванняў і, як вынік, прыкладному патэнцыялу інстытут здолеў скласці шэраг міжнародных кантрактаў і праектаў, якія не толькі дазваляюць праводзіць даследаванні на самым высокім узроўні, але і дазволілі закупіць сур’ёзнае навуковае абсталяванне для лабараторый.

– Даўно вызначыў для сябе важныя прынцыпы працы ў навуцы. Па-першае, варта вызначыцца з выбарам канкурэнтнай тэматыкі. Па-другое, уключыцца ў нацыянальныя праграмы навуковых даследаванняў – без іх мы як без глебы пад нагамі. Па-трэцяе, гэта ўключанасць у міжнародныя праграмы. Менавіта ўдзел у міжнародных праектах, публікацыі ў міжнародных часопісах дазваляюць аб’ектыўна ацаніць свой узровень і хутка ўдасканальваць праграмы даследавання. Па-чацвёртае, гэта прыцягненне маладых кадраў, – каментуе Сяргей Максіменка. Па яго меркаванні, запал не можа з’яўляцца адзінай матывацыяй для маладых навукоўцаў. Доступ да абсталявання, удзел у канферэнцыях, перспектывы абарон дысертацый, годная зарплата – гэта неабходныя ўмовы рэалізацыі патэнцыялу і амбіцый маладых у навуцы, і наша задача зрабіць усё для забеспячэння такіх умоў.

## Значныя дасягненні за 2017 год

Мінулы год быў абвешчаны Годам навукі, і ён для інстытута прайшоў плённа. У галіне фундаментальных даследаванняў вылучаецца наступнае:

– пабудаваная тэорыя перабудоўваной па частаце генерацыі квазічаранкоўскага выпраменьвання ў графене і графен-палімерных слаістых структурах, якая дазваляе ствараць нанапамерныя крыніцы электрамагнітнага выпраменьвання ў тэрагерцавым дыяпазоне (кіраўнікі К. Г. Батракоў, С. А. Максіменка; праца выканана ў рамках задання ДПНД «Фатоніка, опта- і мікраэлектроніка»).

У галіне прыкладных навуковых даследаванняў:

– распрацаваны і перададзены ў вопытную эксплуатацыю макет модуля кантролю за забеспячэннем бяспекі пры збудаванні і ўводзе ў эксплуатацыю Беларускай АЭС і модуля кантролю за радыяцыйнай бяспекай крыніц іанізацыйнага выпраменьвання. Праца важная для арганізацыі сістэмы інфармацыйнай падтрымкі Дзяржатамнагляду, паскарэння атрымання і павышэння захаванасці інфармацыі па кантролі ў галіне ядзернай і радыяцыйнай бяспекі на ўзроўні, які забяспечвае бяспечнае і эфектыўнае развіццё атамнай галіны Беларусі (кіраўнік С. М. Сытова, праца выканана ў рамках задання ДНТП «Інтэлектуальныя інфармацыйныя тэхналогіі»).

## Што наперадзе?

Дзякуючы значным навуковым вынікам НДІ ядзерных праблем БДУ мае аўтарытэт сярод калегаў у краіне і за яе межамі, што дазваляе запрашаць іх на арганізаваныя інстытутам канферэнцыі і школы. Гэта не толькі значныя для ўніверсітэта навуковыя падзеі, але і ўнёсак у фарміраванне пазітыўнага іміджу нашай краіны на сусветнай арэне.

У чэрвені 2018 года адбудзецца 3-я міжнародная навуковая канферэнцыя «Фундаментальны і прыкладны нанаэлектрамагнетызм», фундаваная праграмай НАТА «Навука дзеля міру», а ў верасні пройдзе чарговая міжнародная канферэнцыя па інжынерыі сцынцыляцыйных матэрыялаў і радыяцыйных тэхналогіях. Акрамя таго, інстытут сумесна з АІЯД (Дубна) арганізуе міжнародную школу-канферэнцыю «Актуальныя праблемы фізікі мікрасвету» (жнівень 2018). А зусім хутка, 26–28 лютага, у інстытуце адбудзецца семінар LHC Days in Belarus 2018, прысвечаны ўдзелу беларускіх навукоўцаў у эксперыментах на Вялікім адронным калайдары ў Еўрапейскай арганізацыі ядзерных даследаванняў.

**Алена ЛЯЎШЭНЯ**

# Новы фармат

чыліся ў працэс і самастойна забяспечваюць электронную рэдакцыю матэрыялаў. Таксама варта адзначыць добра арганізаваную і якасную працу рэдкалегій «Часопіса БДУ. Геаграфія. Геалогія» і «Часопіса БДУ. Гісторыя». Дзякуючы іх зацікаўленасці ў прасоўванні часопіса і зладжаным дзеянням у гэтых выданняў ёсць усе шансы зарэкамендаваць сябе ў сусветнай навуковай супольнасці як аўтарытэтнае навуковае выданне, таму што мінімальным крытэрыям для ўключэння ў міжнародныя базы даных гэтыя часопісы цалкам адпавядаюць (наладжаны працэс рэцэнзавання). Акрамя таго, у мэтах прасоўвання навуковых перыядычных выданняў універсітэта адпраўлены запыт у Міжнародны цэнтр перыядычных выданняў у Парыжы для прысваення ISSN анлайн-версіям часопісаў, а таксама праводзіцца работа па падрыхтоўцы часопісаў для ўключэння ў прафесійныя базы даных і Scopus.

**Прапаноўваючы нашы часопісы базе даных Scopus, неабходна разумець, якую ролю інфармацыя з часопіса павінна іграць у гэтай базе. Часопіс выконвае шырокі спектр функцый, якія ў цэлым даюць уяўленне:**

- аб напрамках развіцця беларускай навукі і яе дасягненнях, яе канкурэнтаздольнасці і ступені інтэграцыі ў сусветную навуковую супольнасць;
- публікацыйнай актыўнасці нашых аўтараў;
- публікацыйнай актыўнасці і рэйтынгу беларускіх арганізацый па публікацыях іх аўтараў;
- ацэнцы ступені прызнання і ўзроўню беларускіх публікацый у сусветнай супольнасці па даных іх цытавання;
- якасці беларускіх часопісаў у параўнанні з сусветнай плынню выданняў у адпаведнай прадметнай галіне і г. д.

**Уся аналітыка будуецца па даных з часопіса. Карэктнымі і поўнымі гэтыя даныя могуць лічыцца толькі пры якасным прадстаўленні:**

- назвы часопіса;
- загалоўкаў артыкулаў на англійскай мове;
- анатацый на англійскай мове да кожнага навуковага артыкула;
- прозвішчаў аўтараў;
- адрасных звестак пра месца працы аўтараў, у першую чаргу назваў арганізацый;
- прыартыкульных спісаў літаратуры ў раманскім алфавіце (на лацініцы) у такой якасці, каб гэтыя спасылкі маглі быць улічаны пры вывучэнні цытавання публікацый аўтараў і часопіса.

**Каб каманда Scopus узяла часопіс на экспертызу, ён павінен адпавядаць наступным мінімальным патрабаванням:**

- наяўнасць англамоўнага рэзюмэ да кожнага навуковага артыкула;
- наяўнасць працэсу рэцэнзавання кожнай навуковай публікацыі ў часопісе;
- прытрымліванне графіка выпуску выдання;
- наяўнасць ISSN (для друкаванага і / або электроннага выдання);
- наяўнасць сайта (англамоўная версія абавязковая);
- наяўнасць прыартыкульных спісаў літаратуры ў раманскім алфавіце (на лацініцы);
- захаванне публікацыйнай этыкі.

Тэхнічны бок патрабаванняў баз даных Scopus і Web of Science у часопісах выканалі. Зараз справа за іх якасным складнікам – тэкстам артыкулаў.

Уменне напісаць артыкул шмат у чым залежыць ад вопыту навукоўца – чым часцей вы публікуецеся, тым лепш гэта атрымліваецца. І ўсё ж... Неабходна памятаць, што фармат навуковых часопісаў прадугледжвае прытрымліванне навуковага стылю, устаноўленых крытэрыяў, правілаў акадэмічнага пісьма.

**Варта захоўваць вызначаную структуру тэксту, выкарыстоўваць ужывальныя ў абранай галіне фармулёўкі і тэрміны, карэктна афармляць спасылкі на працы іншых аўтараў. Пры напісанні артыкула неабходна звярнуць увагу:**

- на змест артыкула (выразнасць, лаканічнасць, паслядоўнасць выкладання),
- мову і стыль напісання (асабліва гэта тычыцца артыкулаў на замежных мовах),
- тэхнічнае афармленне (у якой праграме рыхтаваць дакумент, як афармляць артыкул і літаратуру – уручную або з дапамогай спецыяльных праграм).

Перад рэдкалегіямі часопісаў шмат важных задач, выкананне якіх не заўсёды знаходзіць падтрымку ў некаторых членаў рэдакцыйна-выдавецкага працэсу. Важна разумець, што БДУ сваімі сіламі прасоўвае часопісы ў міжнародную інфармацыйную прастору, не звяртаючыся па дапамогу да пасярэднікаў, а гэта значыць – цяжкасцяў не пазбегнуць. Паразуменне і сумесная плённая праца прывядзе ўніверсітэт да выдатных вынікаў.

**Наталля ГЕРАСІМОВІЧ,
начальнік упраўлення
рэдакцыйна-выдавецкай работы**

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# Юрфак – тытан студэнцкага спорту

Юрыдычны факультэт стаў пераможцам круглагадовай студэнцкай спартакіяды ў 14 раз запар. Газета «Універсітэт» паразмаўляла з адказнымі за спорт і даведалася, у чым сакрэт шматгадовых поспехаў.

***– 14 перамог – вялікая лічба. Такое ўражанне, што на юрфаку вучацца адны спартсмены…***

– У нас вучацца знакаміты плывец **Ігар Бокі** і барэц **Джавід Гамзатаў**. Акрамя іх яшчэ каля 20 прафесійных спартсменаў. Але з кожным годам мы заўважаем, што аматары паступова набліжаюцца да прафесіяналаў, – дзеліцца факультэцкай статыстыкай **Анжэла Атрошчанка,** адказная за спартыўна-масавую дзейнасць.

**Аляксандр Федаровіч,** старшыня каардынацыйнага савета студактыву юрыдычнага факультэта, адзначае, што некаторыя спартсмены раскрываюцца менавіта на факультэце: паступіўшы, студэнты пачынаюць актыўна займацца спортам і пераходзяць на новы ўзровень.

Таксама ў БДУ існуе сістэма свабоднага наведвання вучэбных заняткаў для найбольш выдатных спартсменаў, якія ўваходзяць у нацыянальную зборную.

– Гэта важна для прафесіяналаў, паколькі яны абараняюць не толькі гонар універсітэта і факультэта, але і гонар краіны, – расказвае намеснік дэкана **Андрэй Шыдлоўскі.** – Асаблівых праблем з наведвальнасцю вучэбных заняткаў у спартсменаў няма. Некаторыя аматары спорту знаходзяцца ў ліку выдатнікаў факультэта.



Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

*Анжэла Атрошчанка і дэкан юрыдычнага факультэта Сяргей Балашэнка атрымліваюць прызы ад загадчыка кафедры фізічнага выхавання і спорту Віктара Каляды*

## БОНУСЫ

***– Хто вашы канкурэнты на ўніверсітэцкай спартакіядзе?***

– Заўсёды студэнты розных факультэтаў высвятляюць паміж сабой, хто лепшы. На юрыдычным факультэце існуе ўнутраны рэйтынг сярод спартсменаў.

Акрамя асноўных узнагарод – кубкаў, медалёў і дыпломаў – студэнты заахвочваюцца прэміямі. Для гэтага на факультэце ёсць спецыяльны студэнцкі фонд матэрыяльнага стымулявання. На адрас бацькоў два разы на год дэканат адпраўляе падзяку ад імя дэкана, у якой ён дзякуе за поспехі ў вучобе і актыўны ўдзел у грамадскім і спартыўным жыцці факультэта.

– Студэнты імкнуцца ўдзельнічаць у мерапрыемствах органаў студэнцкага самакіравання (савет старастаў, прафкам, БРСМ, студсаюз і інш.). Таксама ўсе хлопцы-спартсмены ўваходзяць у апаратыўныя атрады юрыдычнага факультэта, інтэрнатаў, Студгарадка БДУ, МААП, дзе набываюць адміністрацыйны вопыт, што вельмі важна для юрыста, – дзеліцца адметнымі рысамі сістэмы Андрэй Віктаравіч. – Адзначу, што ўдзел у жыцці факультэта – гэта адзін з тых крытэрыяў, якія ўлічваюцца пры прыняцці рашэння аб зніжэнні аплаты за навучанне або пераводу на бюджэтную форму навучання. Сярод такіх студэнтаў заўсёды ёсць спартсмены. Акрамя гэтага, спартыўныя дасягненні студэнтаў улічваюцца пры прадстаўленні месца іншагароднім навучэнцам у інтэрнаце.

## БАРЦОЎСКІ ФАКУЛЬТЭТ

***– Хто са спартсменаў юрыдычнага факультэта зараз на слыху?***

– Нельга не ўспомніць майстра спорту міжнароднага класа **Мікіту Клімовіча**, які ўваходзіць у склад нацыянальнай зборнай па грэка-рымскай барацьбе. Ён атрымаў тытул найлепшага спартсмена БДУ. Яго трэніруе алімпійскі чэмпіён **Камандар Маджыдаў**. Дарэчы, гэта таксама наш выпускнік (скончыў юрфак у 1989 г. – заўв. рэд.). Ён сябар нашага факультэта, – распавядае Анжэла Пятроўна.

**Віктар Завадзіч** стаў «Студэнтам года–2017» юрыдычнага факультэта ў намінацыі «Спорт». Ён прыняў удзел у сусветным студэнцкім футбольным турніры «Кубак шаўковага шляху – 2017» у КНР, дзе каманда БДУ заняла першае месца, – успамінае Анжэла Пятроўна. – Акрамя футбольных поспехаў будучы юрыст удзельнічае ў спаборніцтвах і па лёгкай атлетыцы. На адным з апошніх спаборніцтваў ён узяў бронзу.

***– Андрэй Віктаравіч, раз зайшла гаворка пра Камандара Маджыдава, узнікае пытанне: як часта вы прыцягваеце да працы знакамітых спартсменаў і трэнераў?***

– Камандар Бафаліевіч, які з'яўляецца выпускніком юрфака, ужо стаў «пазаштатным» спартыўным супрацоўнікам факультэта. Акрамя яго адзначу заслужанага трэнера па грэка-рымскай барацьбе **Мікалая Прусава**. Дзякуючы іх сумеснай працы на нашым факультэце вучыцца каля 5 майстроў спорту. Напрыклад, наш студэнт Джавід Гамзатаў заваяваў бронзавы медаль на Алімпійскіх гульнях–2016 у Рыа-дэ-Жанэйра. Юрфак стаў «барцоўскім факультэтам» дзякуючы знакамітым людзям!

Многія спартсмены заканчваюць магістратуру і аспірантуру, а пасля ідуць выкладаць на юрфак. Напрыклад, **Таццяна Бойка** – суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, дацэнт кафедры фінансавага права і прававога рэгуля-

# Нам патрэбныя здаровыя кадры

Перадавыя кампаніі ахвотна інвеструюць у здароўе супрацоўнікаў, бо гэта адбіваецца на эфектыўнасці працы. БДУ сочыць за тэндэнцыямі і стварае ўмовы для таго, каб кожны супрацоўнік мог палепшыць сваю фізічную форму.

– Нам патрэбныя здаровыя кадры. Калі няма праблем з хваробамі, то супрацоўнік дае добры вынік у працы. Ва ўніверсітэце гэта разумеюць, – распавядае **Васіль Амялюсік,** старшыня спартыўна-масавай камісіі Прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў БДУ. – Здароўе чалавека трымаецца на кардыярэспіраторнай сістэме. Наколькі яна забяспечвае кожную клетачку кіслародам, настолькі эфектыўна функцыянуе наш арганізм. Кардыярэспіраторную сістэму трэба трэніраваць, даваць ёй анаэробную нагрузку.

Для тых, хто хоча палепшыць сваё здароўе ці падтрымаць арганізм у тонусе, ва ўніверсітэце працуюць 42 групы здароўя, арганізаваныя пры падтрымцы прафкама. Усе заняткі праводзяцца бясплатна, а наведваць іх можа любы супрацоўнік, які з'яўляецца членам прафсаюза. Алгарытм запісу просты: неабходна звязацца з кіраўніком групы, якую жадаеце наведваць, і напісаць заяву. Пры наяўнасці вольных месцаў далучыцца да групы можна нават на працягу года. А абраць ёсць з чаго: фізічную актыўнасць даспадобы знойдуць сабе і аматары гульнявых відаў спорту (працуюць групы па футболе, валейболе, баскетболе, настольным тэнісе, шахматах), і тыя, хто жадае працаваць над целам у спартыўнай зале, займаючыся фітнэсам ці атлетычнай гімнастыкай. Асаблівай папулярнасцю ў супрацоўнікаў карыстаюцца групы па плаванні:

– На заняткі прыходзяць людзі з рознымі фізічнымі магчымасцямі і рознага ўзросту ў першую чаргу для аздараўлення. Хтосьці калісьці плаваў і цяпер прыходзіць падтрымліваць форму, а хтосьці па рэкамендацыі урача, напрыклад, для рэабілітацыі пасля траўмы, – дзеліцца Васіль Амялюсік, які сам з'яўляецца кіраўніком груп здароўя па плаванні і валейболе.

У раскладзе заняткаў можна знайсці адразу некалькі груп АФП (агульная фізічная падрыхтоўка). Кожная з іх мае свой ухіл, напрыклад, на практыкаванні з элементамі ёгі ці лячэбную фізкультуру. Зазіраем на заняткі групы пад кіраўніцтвам **Алы Расолькі**, дацэнта кафедры фізвыхавання і спорту. Пад рытмічны лік «раз, два, тры, чатыры» дзяўчаты выконваюць практыкаванні, а трэнер сочыць за тэхнікай і папраўляе, калі патрабуецца. У перапынку Ала Іванаўна распавядае, што на заняткі бярэ ўсіх ахвотнікаў, у яе групе 20



Фота Таццяны БАГАМАЗАВАЙ

чалавек. Пасля пытаемся ў прысутных, як прайшла трэніроўка:

– Тут зараджаешся станоўчымі эмоцыямі, бліжэй знаёмішся з калектывам, у якім працуеш, – дзеліцца **Ірына Клімовіч,** камендант галоўнага навучальнага корпуса БДУ. – Хаджу на заняткі для падтрымання добрай фізічнай формы, для здымання стрэсу пасля цяжкага працоўнага дня. Гэтыя заняткі для радасці і добрая магчымасць займацца бясплатна, абы было жаданне хадзіць.

У яшчэ адной групе АФП адцягваем ад трэніроўкі маладога чалавека:

– Я прыходжу займацца на трэнажорах, каб расслабіцца, падтрымаць сваю фізічную форму. Гэта вельмі цудоўна, што супрацоўнікі могуць прыходзіць займацца пасля працы, – адзначае аспірант фізічнага факультэта **Сяргей Назараў** і дадае: – А яшчэ гэта выдатная магчымасць падрыхтавацца да спаборніцтваў для тых, хто ўдзельнічае ў штогадовай спартакіядзе нашага ўніверсітэта.

Пры адкрыцці груп здароўя арыентуюцца на просьбы і жаданні сяброў прафсаюза:

– Супрацоўнікі пішуць заявы, мы бачым, што ў нас па нейкім кірунку набіраецца група 10–12 чалавек, тады мы шукаем чалавека, які зможа весці гэту групу, а ўсе кіраўнікі нашых груп – кваліфікаваныя спецыялісты, – распавядае Васіль Амялюсік. – Вядома, супрацоўнікі хацелі б у тым ліку займацца такімі папулярнымі цяпер кірункамі фітнэсу, як пілатэс ці зумба, але праблематычна знайсці чалавека, які б пагадзіўся весці групу за тую аплату, якую мы можам прапанаваць.

Вялікая ўвага ва ўніверсітэце надаецца здароўю не толькі супрацоўнікаў, але і іх дзяцей. Для іх адкрыты дзве групы: плаванне і аэробіка.

– Гэта група працуе першы год, – распавядае **Наталля Астрэйка**, старшы выкладчык КФіС, кіраўнік групы па аэробіцы для дзяцей. – Я прымаю дзяцей любога ўзросту, цяпер ходзяць на заняткі дзеці ад 6 да 13 гадоў. Тут можна атрымаць харэаграфічную, бегавую, скачковую падрыхтоўку, развіць каардынацыю, гнуткасць, сілавыя якасці. У любым выпадку, у залежнасці ад падрыхтоўкі, даю дзецям розную нагрузку: хтосьці займаецца спартыўнай аэробікай, а хтосьці – аздараўленчай гімнастыкай.

Падрабязней азнаёміцца з пералікам і раскладам усіх дзейных груп здароўя можна на сайце *tradeunion.bsu.by* у раздзеле «Спорт». На шляху да здароўя галоўнае – пачаць займацца і рабіць гэта рэгулярна:

– Для таго, каб дамагчыся эфекту, неабходна прытрымлівацца двух прынцыпаў: не перанапружвацца і займацца рэгулярна, – дае рэкамендацыі Васіль Амялюсік. І ўсё роўна, займаецеся вы валейболам ці плаваннем. Пажадана, каб фізічная нагрузка была хоць бы тры разы ў тыдзень, таму што пры двухразовай нагрузцы мы можам казаць толькі пра нейкае падтрыманне таго стану, які ёсць, а пры трохразовай можна ўжо казаць пра невялікую трэніраванасць.

вання гаспадарчай дзейнасці (па сумяшчальніцтве), майстар спорту міжнароднага класа па скачках у вышыню.

**МЕНЕДЖМЕНТ**

***– Спартыўнае жыццё факультэта насычанае. Якія спосабы папулярызацыі працуюць на юрфаку?***

– На першым сходзе студэнтаў-першакурснікаў адміністрацыя факультэта тлумачыць агульныя пытанні навучальнага працэсу, у тым ліку і па фізічным выхаванні. Потым праводзіцца лекцыя па фізічнай культуры, на якой першакурснікі знаёмяцца з сістэмай спорту ва ўніверсітэце. Далей кожны студэнт выбірае па сваім жаданні, – прыводзіць Аляксандр Федаровіч.

– Сёння спорт – гэта яшчэ і менеджмент, а не толькі спартыўныя поспехі. Анжэла Пятроўна – гэта наш «топ-менеджар». Стратэгічная расстаноўка сіл спрыяе папулярызацыі і прыцягненню студэнтаў, – распавядае Андрэй Віктаравіч.

– Штогод дэкан юрыдычнага факультэта Сяргей Аляксандравіч Балашэнка з удзелам іншых прадстаўнікоў дэканата і я абмяркоўваем праграму развіцця кожнага віду спорту паасобку, – расказвае Анжэла Пятроўна.

Дарэчы, Анжэла Атрошчанка – сама прыклад для студэнтаў, яна з'яўляецца ўдзельніцай трох алімпіяд: Барселона–1992, Атланта–1996, Афіны–2004; майстар спорту міжнароднага класа па лёгкай атлетыцы.

Спартакіяда БДУ заўсёды ў прыярытэце юрыдычнага факультэта!

**Вераніка ГАМЗЮКОВА**

**А ДЛЯ СТУДЭНТАЎ...**

Магчымасць займацца спортам бясплатна ёсць таксама ў сяброў студэнцкага прафкама БДУ. Абанементы ў трэнажорную залу і басейн выдаюцца кожныя два месяцы пры наяўнасці медыцынскай даведкі. Дэведацца падрабязнасці і сачыць за датамі выдачы – *www.vk.com/profkombsu*.

**Валерыя БАНДАРЧЫК**

**ДАВЕДКА**

По дадзеных СААЗ, ва ўсім свеце фізічная інертнасць з'яўляецца асноўнай прычынай лішняй масы цела і атлусцення, неінфекцыйных захворванняў і хранічных паталогій, у ліку якіх дыябет, гіпертанія, сардэчна-сасудзістыя хваробы, розныя формы злаякасных наватвараў, стрэс, дэпрэсія. Пры гэтым наступствы фізічнай інертнасці не толькі прамыя, якія тычацца здароўя, але і ўскосныя – зніжэнне аб'ёмаў вытворчасці з прычыны хвароб, непрацаздольнасці, ці заўчаснай смяротнасці. Па ацэнках, калі колькасць насельніцтва складае 10 мільёнаў, пры гэтым 50 % насельніцтва характарызуюцца недастатковай фізічнай актыўнасцю, то штогадовыя выдаткі даходзяць да 910 млн еўра.

РЭХА ГІСТОРЫІ

# Праз віхуры рэвалюцыі да асветы

**Рэвалюцыйныя падзеі, якія пракаціліся па Расійскай імперыі ў 1917 годзе, паўплывалі на фарміраванне беларускай дзяржаўнасці, у тым ліку на стварэнне сістэмы нацыянальнай адукацыі. Менавіта грамадска-палітычныя працэсы пач. XX ст. сталі штуршком і для рэалізацыі ідэі стварэння ў Беларусі першага нацыянальнага ўніверсітэта.**



*Я. Гурвіч*




*Пераклад спадчыны К. Маркса*

Сярод першых прафесараў і выкладчыкаў БДУ было нямала актыўных удзельнікаў грамадскіх і палітычных рухаў, напрыклад, Вільгельм Кнорын – адзін з арганізатараў Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, стваральнік бальшавіцкіх арганізацый на Заходнім фронце; Усевалад Ігнатоўскі – сябра партыі эсэраў (1901–1917), Беларускай Сацыялістычнай грамады (1917–1918), член КП(б)Б (1924–1931), і многія іншыя.

Сёння ёсць нагода ўспомніць, можа, і не такое гучнае імя, але, безумоўна, заўважную асобу, якая займае сваё месца ў гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Беларусі і ўваходзіць у кагорту стваральнікаў БДУ. Размова пойдзе пра **Яўгенію Гурвіч, першую загадчыцу бібліятэкі БДУ**.

Яўгенія Гурвіч нарадзілася ў Вільні ў 1861 г. і з юных гадоў захапілася рэвалюцыйнымі ідэямі. Ужо ў 1879 г. яна ў 18-гадовым узросце увайшла ў рэвалюцыйную арганізацыю "Зямля і воля". У той час яна вучылася ў Пецярбургу на жаночых лекарскіх курсах, якія ёй не ўдалося скончыць, бо ў тым жа 1879 г. была выслана са сталіцы за ўдзел у народніцкім руху. У пачатку 1880-х гадоў яна некалькі гадоў жыла ў Швейцарыі. Пасля вяртання ў 1884 г. у Мінск сумесна з вядомым рэвалюцыянерам-народнікам Анатолем Бонч-Асмалоўскім Я. Гурвіч актыўна наладжвала падпольны друк у Мінску. У той час за ёй замацаваўся партыйны псеўданім Франц Курскі.

У 1890-я гады Я. Гурвіч увайшла ў склад ЦК Бунда – яўрэйскай сацыялістычнай партыі, на той час найбуйнейшай і найбольш арганізаванай на тэрыторыі Расійскай імперыі.

Менавіта ў гэты час Я. Гурвіч, якая жыла ў Мінску і не мела сувязяў з выдаўцамі, робіць свой пераклад на рускую мову першага тома «Капітала» Карла Маркса. Як вядома, першы пераклад быў зроблены Германам Лапаціным і Мікалаем Даніельсанам у 1872 годзе, але кніга хутка стала бібліяграфічнай рэдкасцю. На губернскі Мінск было ўсяго 2–3 асобнікі, а атрымаць дазвол на перавыданне ад Лапаціна было немагчыма, бо ён знаходзіўся ў той час у Шлісельбургскай крэпасці.

Сумесна з Львом Знакам, адным з першых беларускіх прапагандыстаў-народнікаў, Я. Гурвіч перакладала першы том, прычым перакладчыкі карысталіся не толькі нямецкім арыгіналам, але і французскім выданнем. Яна валодала пяццю замежнымі мовамі, мела дыплом аб вышэйшай адукацыі, які атрымала ў Швейцарыі.

Пазней пры спрыянні А. Бонч-Асмалоўскага перакладзены том пабачыў свет у выдавецтве Вольгі Паповай у Санкт-Пецярбургу.

У пачатку 1898 г. Я. Гурвіч актыўна ўключылася ў арганізацыю першага з'езду РСДРП, які праходзіў у Мінску. Ёй было даручана рыхтаваць для дэлегатаў канспіратыўныя кватэры, з яе ўдзелам для правядзення з'езду быў выбраны вядомы дом Румянцава на Захар'еўскай вуліцы (цяпер дом-музей I з'езда РСДРП). Праз тыдзень пасля з'езду большасць яго ўдзельнікаў былі арыштаваны, Я. Гурвіч арыштавалі ў ліпені 1898 года. Яе перавезлі ў Маскву і змясцілі ў Таганскай турме. Пазней, паводле прысуду, яна была саслана на чатыры гады ў Верхаленск Іркуцкай губерні.

У ссылцы Я. Гурвіч працягвала падтрымліваць зносіны са сваімі паплечнікамі, і сваю чаргу, рыхтавалі яе ўцёкі. Датай было прызначана 21 жніўня 1902 года. У Верхаленску на той час быў яшчэ адзін вязень, якога трэба было як мага хутчэй вызваліць. Гэта быў вядомы рэвалюцыйны дзеяч Леў Троцкі. Вырашылі арганізаваць уцёкі абодвух рэвалюцыянераў, што было яшчэ больш небяспечным. У выніку адзін знаёмы селянін вывез ссыльных ноччу на возе, накрытым саломай. Далей па падробленых дакументах ім удалося выехаць за мяжу.

Зноў апынуўшыся ў Швейцарыі, Я. Гурвіч працягвала адукацыю, удзельнічала ў перакладзе першага тома «Літаратурнай спадчыны К. Маркса і Ф. Энгельса».

Пасля амністыі ў 1906 годзе Яўгенія Гурвіч вяртаецца ў Мінск. Тут яна занялася педагагічнай і бібліятэчнай работай. На пэўны час ёй удалося ўладкавацца на працу ў Гарадскую публічную бібліятэку імя А. С. Пушкіна, якая размяшчалася ў доме Ленскіх на Хрышчэнскай вуліцы (цяпер вул. Інтэрнацыянальная, 31). У зборах гэтай бібліятэкі было шмат прагрэсіўнай і рэвалюцыйнай літаратуры, у тым ліку забароненай. Паводле ўспамінаў С. Скандракова, які быў членам праўлення бібліятэкі, яна стала своеасаблівым палітычным цэнтрам у Мінску. Пасля рэвалюцыйных падзей 1905 года чытальныя залы былі зручным месцам для канспіратыўных сустрэч. Праўда, у 1907 годзе ў будынку бібліятэкі паліцыя раскрыла падпольную друкарню, а ў 1909 годзе супрацоўнікі бібліятэкі Віктар і Зыгмунд Зелезі і іх памочніца Маршак былі арыштаваны.

Імя Яўгеніі Адольфаўны Гурвіч зноў з'яўляецца ў гістарычных дакументах пасля Лютаўскай рэвалюцыі ў Расіі. На выбарах у Мінскую гарадскую думу 30 ліпеня 1917 года яна праходзіць па спісах Бунда. У Думе займаецца пытаннямі адукацыі. Пры яе ўдзеле восенню 1917 года Дума прызнала афіцыйнымі мовамі беларускую, ідыш, рускую і польскую, якія пазней, у БССР, набылі статус дзяржаўных моў і захоўвалі гэты статус да 1938 года.

Пасля ўсталявання савецкай улады Я. Гурвіч стала загадчыцай пазашкольнага аддзела Народнага камісарыята асветы БССР. А ў жніўні 1920 г. яна ўвайшла ў камісію па стварэнні БДУ і ўзначаліла работу па фарміраванні бібліятэкі. Бібліятэка БДУ, паводле задумы арганізатараў, павінна была стаць першай універсітэцкай, першай дзяржаўнай і першай навуковай бібліятэкай на тэрыторыі Беларусі. Для гэтага Наркамасветы збіраў кнігі са спустошаных бібліятэк навучальных устаноў Мінска, заклікаў гараджан здаваць кнігі, атрымалыя ў бібліятэках да рэвалюцыі. Усяго ў БДУ ў гэты час было перададзена каля 70 тысяч тамоў.

Яўгенія Гурвіч рабіла захады і для перадачы кніг з-за мяжы. Так, у бібліятэку БДУ ў 1922 годзе было перададзена некалькі тысяч тамоў з ЗША, з асабістай бібліятэкі брата Яўгеніі – Ісака Гурвіча. Ён таксама быў актыўным удзельнікам мінскага народніцкага падполля, не раз быў арыштаваны і вымушаны быў з'ехаць у эміграцыю ў Нью-Ёрк, дзе актыўна займаўся грамадскай дзейнасцю і эканамічнымі даследаваннямі.

У непрыстасаваных памяшканнях, пры адсутнасці абсталявання, Я. Гурвіч арганізавала апрацоўку значных аб'ёмаў літаратуры. Распачатая летам 1921 года падрыхтоўка ў асноўным была скончана да канца года, а ўжо з новага 1922 года бібліятэка пачала сваю паўнавартасную работу. Яўгенія Адольфаўна здзейсніла паездку ў Маскву дзеля вывучэння вопыту работы акадэмічных бібліятэк і для пошуку крыніц камплектавання фонду.

У канцы 1921 года Я. Гурвіч была арыштавана падчас кампаніі па разгроме правых эсэраў і саслана ў Аланецкую губерню. Пасля вызвалення ў верасні 1922 года яна засталася ў Маскве, дзе ўладкавалася навуковым супрацоўнікам Інстытута К. Маркса і Ф. Энгельса. Там яна апублікавала шэраг успамінаў пра рэвалюцыйны рух у Беларусі. У канцы 1920-х гадоў удзельнічала ў падрыхтоўцы новага выдання работы К. Маркса «Да крытыкі палітычнай эканоміі». Дарэчы, у той час у інстытуце пад кіраўніцтвам Давіда Разанава была створана адна з найлепшых на той час у свеце бібліятэк па сацыяльна-палітычных навуках.

Паўторна Яўгенія Гурвіч была арыштавана органамі ДПУ ў лютым 1931 года ў час кампаніі па разгроме «Саюзнага бюро меншавікоў». З-пад арышту была вызвалена ў красавіку з-за адсутнасці доказаў. Памерла Яўгенія Адольфаўна ў Маскве ў 1940 годзе.

У Фундаментальнай бібліятэцы БДУ не забываюць пра сваю першую загадчыцу. Яна, безумоўна, была яркай, адукаванай і таленавітай асобай. Хоць яе працоўны стаж у БДУ не быў доўгім, але дзякуючы яе намаганням была створана і пачала сваю дзейнасць першая ўніверсітэцкая бібліятэка на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Дзеля ўшанавання памяці Я. Гурвіч у Электроннай бібліятэцы БДУ пачата праца па стварэнні калекцыі дакументаў пра яе жыццё і дзейнасць. Калекцыя ўтрымлівае копіі дакументаў з асабістай справы Я. Гурвіч, атрыманыя з фонду Нацыянальнага архіва Беларусі, а таксама апублікаваныя ўспаміны і лісты. Калекцыя даступная па спасылцы: http://elib.bsu.by/handle/123456789/184428

**Уладзімір КУЛАЖАНКА,**
**дырэктар Фундаментальнай бібліятэкі БДУ**

КОНКУРСЫ

# Чый медыйны рэсурс найлепшы?

**Вынікі першага конкурсу «Найлепшы медыйны рэсурс БДУ» падведзены ва ўніверсітэце. Так, у паднамінацыі «Найлепшы Instagram-акаўнт» перамог механіка-матэматычны факультэт, «Найлепшы Youtube-канал» у Студэнцкага тэлебачання ВНУ, а «Найлепшы блог» у творчай студыі «Мім-БДУ».**

Перамогу ў паднамінацыі «Найлепшая супольнасць у сацыяльнай сетцы «Укантакце» падзялілі студэнцкі савет па якасці адукацыі і філалагічны факультэт. У паднамінацыі «Найлепшая студэнцкая газета» вылучана перыядычнае выданне хімічнага факультэта Chemical Boom. Таксама ў дадзенай паднамінацыі спецыяльным дыпломам за цікавае асвятленне жыцця факультэта адзначана газета гістарычнага факультэта «НІКА».

У намінацыі «Найлепшая медыйная прастора БДУ» лідары вызначаліся ў паднамінацыях «Факультэт» і «Маладзевая арганізацыя». Так, у першай пераможцам стаў Ліцэй БДУ. На другім і трэцім месцах – механіка-матэматычны і філалагічны факультэты адпаведна. У другой паднамінацыі найлепшым прызнана медыйная прастора Пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ.

Нагадаем, што ўсяго ў змаганні медыйных рэсурсаў ВНУ прынялі ўдзел 40 рэдакцыйных калектываў факультэтаў, грамадскіх арганізацый і органаў студэнцкага самакіравання, а таксама адміністратараў дадзеных інтэрнэт-рэсурсаў.

Арганізатарамі конкурсу выступілі ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю і Медыяцэнтр БДУ. Правядзенне конкурсу накіравана на раскрыццё творчага патэнцыялу моладзі, стымуляванне яе ініцыятыў, інфармацыйна-даведкавую і прававую падтрымку навучэнцаў БДУ, а таксама развіццё адзінай маладзевай інфармацыйнай прасторы ВНУ.

Падвядзенне вынікаў адбылося 11 студзеня.







Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

# «Вакацыі ў Лагойску»: час, які правялі разам

Свята «Вакацыі ў Лагойску» прайшло 25 студзеня ў Дзень Таццяны, заступніцы студэнцтва. Гарналыжны спартыўна-аздараўленчы комплекс «Лагойск» прыняў больш за паўтысячы актыўных студэнтаў і выкладчыкаў Белдзяржуніверсітэта. Удзельнікі спаборнічалі ў лыжнай эстафеце, каталіся на больш экстрэмальных горных лыжах, сноўбордзе і цюбінгу, сустрэліся са знакамітай біятланісткай. Арганізавала гэта мерапрыемства пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ.

Рэцэпт вясёлага адпачынку спазнавалі ўсе разам. Удзельнікамі маштабнай акцыі сталі студэнты, кіраўніцтва ВНУ, выкладчыкі, супрацоўнікі БДУ. Віншавальным словам адкрыў гэта свята рэктар **Андрэй Кароль:**

– Заканчэнне сесіі – знамянальная падзея ў жыцці студэнтаў. Гэта добрая нагода адзначыць гэту радасную падзею эмоцыямі, карыснымі фізічнымі нагрузкамі і спартыўнымі дасягненнямі. Хочацца, каб падобныя мерапрыемствы, якія грунтуюцца на сумесным баўленні часу студэнтаў, выкладчыкаў і кіраўніцтва ВНУ, былі рэгулярнымі. Гэта добры фармат, які дазваляе згуртаваць наш калектыў.

Як адзначыла старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ **Вольга Локцева,** сустракаць Дзень Таццяны на лыжні стала традыцыяй. Ужо ў трэці раз зімовае свята праходзіць у Лагойску. У сваім звароце да ўдзельнікаў Вольга пажадала, каб дзень запомніўся ўсім яркімі эмоцыямі, хуткай лыжнёй і заваяваннем самых высокіх вяршынь. У такім настроі і праходзіў гэты дзень.

Таццянін дзень, ці Дзень студэнцтва, звязваюць з імем раннехрысціянскай пакутніцы Таццяны Рымскай, пра якую кажуць у праваслаўнай царкве 25 студзеня. Пра вытокі свята нагадалі протадыякан **Максім Логвінаў,** кіраўнік аддзела па рабоце з моладдзю Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы, і протаіерэй **Алег Голубеў,** першы прарэктар Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла. Яны заклікалі студэнтаў развівацца фізічна, духоўна і інтэлектуальна, бо ва ўніверсітэце ёсць для гэтага ўсе магчымасці.

Адчуць дух спаборніцтва выйшлі ў лыжнай эстафеце 4 каманды: рэктарата і прадстаўнікоў духавенства; дэканаў; работнікаў і студэнтаў – чатыры этапы па 400 метраў удзельнікі прайшлі са спартыўным запалам. Каб падтрымаць здаровыя ідэі, на лыжню сёлета ўпершыню выйшаў і рэктар БДУ. Першай фінішавала каманда студэнтаў, у склад якой увайшлі: **Яўген Дарожка** (філфак), **Яраслаў Падрэз** (фізфак), **Уладзімір Фядотаў** (геафак) і **Цімафей Швайба** (ІБМТ). Серабро дасталася прадстаўнікам рэктарата, трэцяй завяршыла эстафету каманда супрацоўнікаў.

У выязны Дзень студэнта можна было атрымаць парады ад майстра спорту міжнароднага класа. Прайшла сустрэча студэнтаў з **Вольгай Назаравай,** чэмпіёнкай Еўропы, двухразовым бронзавым прызёрам чэмпіянатаў свету, 11-разовай чэмпіёнкай свету па летнім біятлоне. Знакамітая біятланістка стала хэдлайнерам студэнцкага свята. Спартсменка распавяла пра сваю кар'еру, падзялілася тым, як пераадольваць цяжкасці і страхі. Надала ўвагу важнасці спорту, які дапамагае шанаваць час і гартуе характар. Біятланістка прызналася, што, хоць і нарадзілася ў Расіі, але любіць абедзве краіны аднолькава, бо ў Беларусі ў яе склалася і сям'я, і кар'ера. Вольга распавяла, што ў апошні час захапляецца фатаграфіяй і псіхалогіяй. У псіхалогіі яна шукае тыя інструменты, якія дазваляюць дасягаць выніку, матывуюць на перамогу. Гэту формулу мыслення пераможцы яна як трэнер-метадыст Беларускай федэрацыі біятлона перадае маладому пакаленню. Нават пасля завяршэння спартыўнай кар'еры Вольга не выпала з беларускага біятлона, а дапамагае яму развівацца.

У гэты дзень студэнты акунуліся ў сапраўднае зімовае шматбор'е. Адолелі не толькі спрынт на роўнай лыжні, але і старт са схілу на горных лыжах ці сноўбордзе. Таксама падчас зімовага свята працавалі зоны актывацый: удзельнікі паспаборнічалі ў жартаўлівым зімовым сумо і футболе, змаглі пастраляць у ціры. Многія сталі на горныя лыжы ўпершыню, але перамаглі страхі і ўсталявалі свае асабістыя рэкорды.

**Любоў Ланіна,** студэнтка факультэта філасофіі і сацыяльных навук:

– Мой першы Дзень студэнта запомніцца як халодны, але цікавы і вясёлы дзень. Запомніцца кіраўніцтва ВНУ на лыжах, сустрэча з Вольгай Назаравай. Дзякуючы «Вакацыям у Лагойску» я змагла ўпершыню пакатацца на лыжах са схілу! Я даўно не стаяла на лыжах, але работнікі комплексу праводзілі інструктаж і дапамагалі пачувацца больш упэўнена. Гэта было захапляльна! Мае сябры вучыліся катацца на сноўбордзе, думаю, у наступны раз таксама паспрабую.

Дзень Таццяны выдаўся яркім, бадзёрым і па-сяброўску цёплым. Час прайшоў хутка, гарналыжны комплекс пакінулі ўвечар. Свята мела поспех, таму будзем чакаць ізноў прыезду ў Лагойск.

**Алена ЛЯЎШЭНЯ**

ДА ЎВАГІ

# Як зрабіць ток бяспечным?

**Усе ведаюць, што электрычны ток нясе ў нашы дамы святло, дапамагае працаваць бытавой тэхніцы – адным словам, дае мноства даўно звыклых выгод. На жаль, звычка і ўяўная прастата ў карыстанні спараджаюць легкадумнае стаўленне да электрычнасці, людзі ўвесь час падвяргаюць рэальнай небяспецы здароўе і жыццё сваё і сваіх блізкіх.**

Напрыклад, пры замене перагарэлай лямпачкі. Часта няправільна выконваецца мантаж электраправодкі і асвятляльнай арматуры (патрона). Нярэдкія выпадкі, асабліва ў дамах старой пабудовы, калі выключальнікі ўсталёўваюцца ў ланцугі нулявога, а не фазнага провада, няправільна падключаюцца токаводныя гільзы патронаў лямпаў асвятлення і засцерагальнікаў. Любое з гэтых парушэнняў можа стварыць небяспечную сітуацыю, а спалучэнне памылак – прамы шлях да электратраўмы і нават смерці чалавека. Памятайце, замену лямпаў неабходна ажыццяўляць толькі пры поўным абясточванні электраприбора.

Адмысловую ўвагу хацелася б надаць падключэнню пральных машын. Няма праблем у жыхароў новабудоўляў, у праектах сучасных дамоў першапачаткова прадугледжаны выкарыстанне меднай трохправадной праводкі ў аднафазнай групавой сетцы пераменнага току, а таксама ўстаноўка на разетачную сетку прылады ахоўнага адключэння (ПАА). Цяжэй жыхарам кватэр, дзе праводка двухправадная алюмініевая, з якой часам перавышаецца допушчальная нагрузка сеткі па току, разеткі не маюць заземляльнага кантакта, устаноўка ПАА немагчымая без рэканструкцыі сеткі. Тут часцяком для падключэння пральнай машыны абмяжоўваюцца ўстаноўкай еўраразеткі з заземляльным кантактам, а гэта недапушчальна. Падключэнне заземляльнага кантакта еўраразеткі з дапамогай перамычкі ад нулявога кантакта абароніць пры прабоі ізаляцыі і вынасе патэнцыялу на корпус пральнай машыны, узнікае кароткае замыканне і спрацуе аўтаматычны выключальнік. Але застаецца рызыка – парушэнне цэласнасці нулявога праваднікa, які можа выпадкова адключыцца, адгарэць, страціць электраправодныя ўласцівасці ў выніку хімічных рэакцый. І тады праз перамычку і заземляльны кантакт разеткі на корпус пральнай машыны выносіцца небяспечны патэнцыял. Для аптымальнага падключэння пральнай машыны патрабуецца пракладка трохправадного кабеля ад паверхавага шчытка, плюс устаноўка ПАА і еўраразеткі. Але ў гэтага дарагога варыянта ёсць нядрэнная альтэрнатыва – выкарыстанне пакуль рэдкіх у нашых краях ПАА-разетак, якія спалучаюць у сабе еўраразетку і ПАА. Ужыванне такіх навінак дазволіць падключыць пральную машыну без пракладкі трохжыльнага кабеля.

**С. І. ГЛУБОКІ,**
**дзяржаўны інспектар**
**па энергетычным наглядзе**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

31 студзеня 2018 года
Падпісана да друку 30.01.2018 г.
Зак. ___. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ».
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*